От потерпевших была получена информация о том, кто являлся агрессором в их семье. Так, в 46,3 % случаев – это муж, в 17,6 % – сын, 14,3 % – брат, в 7,3 % – отец. В единичных случаях также субъектами насилия были жена, мать, дочь и внук, что в совокупности составило 7,4 %. Опрос также показал, что примерно в 85 % случаев субъекты насилия страдают алкогольной зависимостью.

Все представители исследуемой группы имели опыт обращения за помощью в правоохранительные органы по месту проживания. При этом в 8,7 % случаев потерпевшие от домашнего насилия оказались удовлетворены оказанной им помощью, в 39,1 % случаев – удовлетворены частично или не всегда и в 52,2 % случаев – не удовлетворены совсем. Заметим, что последние сетовали на то, что «милиции нет до нас дела», что «к нам относятся как отбросам общества», «не считают мои проблемы серьезными». Жертвы домашнего насилия жаловались и на манеру общения сотрудников правоохранительных органов, считая ее пренебрежительной.

Также мы выяснили, знают ли жертвы домашнего насилия, куда обратиться за психологической помощью: 26,1 % опрошенных ответили на данный вопрос положительно, оставшиеся 73,9 % – отрицательно, при этом 8,7 % из ответивших отрицательно заметили, что при необходимости смогут найти нужную информацию в сети Интернет. Реально за психологической помощью обращались лишь 8,7 % представителей исследуемой выборки. Оставшиеся 92,3 % не имеют опыта обращения за психологической помощью.

Из этого можно сделать вывод, что между правоохранительными органами и специалистами либо организациями, оказывающими психологическую помощь, не налажено должное взаимодействие. Между тем в отделениях милиции висят плакаты с призывом остановить домашнее насилие и номерами телефонов, по которым можно получить юридическую и психологическую помощь.

О том, что лица, пострадавшие от домашнего насилия, остро нуждаются в психологической помощи и вмешательстве сотрудников правоохранительных органов в их жизненную ситуацию, свидетельствуют следующие результаты нашего исследования.

У 73,3 % лиц, подвергающихся домашнему насилию, наблюдается высокий уровень стресса, у 26,7 % – средний, а низкий уровень отсутствует. Следовательно, совместное проживание с лицами, склонными к различным формам насилия (в особенности к физическому), – это условия хронического или пролонгированного стресса. Несмотря на то что для большинства жертв это ситуация не новая, значимость стрессора не снижается, т. е. у жертв не наступает период адаптации к тем условиям, в которых они проживают. Вероятно, это связано со страхом за свою жизнь, что и подкрепляет актуальный уровень стресса.

На вопрос «Какие ассоциации связаны у вас с домом?» были получены следующие варианты ответов. Наиболее часто у лиц, страдающих от домашнего насилия, вопрос о доме связывается с ответом «не хочется идти домой», что было выявлено у 39,1 % выборки; у 27,1 % опрошенных возникает ассоциация с обидой, 13 % – со слезами. Эти ответы отражают типичную позицию жертвы. У 8,7 % опрошенных дом ассоциируется со страхом. Оставшиеся ассоциации – «душа болит», «чернота», «страдание», «боль», «горе», «пьяный муж», «безысходность», «раздражение», «грязь» – были представлены в единичных случаях и охватили 39,1 % выборки.

Проанализировав ответы на вопрос «Какие у вас есть страхи, связанные с проживанием в вашей квартире?», мы выявили следующее распределение ответов: 34,8 % лиц переживают страх быть убитыми; 30,4 % – страх пожара в квартире по вине пьяного члена семьи; 26,1 % – страх быть избитыми; 17,4 % – страх быть изнасилованными, страх, касающийся порчи имущества, страх заразиться венерической болезнью и страх быть обворованными. 13 % жертв домашнего насилия связывают свои страхи с потерей благополучия детей и других родственников.

Таким образом, как показывают результаты нашего исследования, необходимо совершенствовать взаимодействие сотрудников органов внутренних дел и лиц, подвергшихся домашнему насилию, и на практическом, и на законодательном уровнях. При игнорировании проблемы домашнего насилия в массовом сознании формируется представление, что это можно делать и что это ненаказуемо. Президентом Республики Беларусь А. Лукашенко на коллегии МВД по итогам работы органов внутренних дел за 2015 г. было сказано в адрес милиции: «Вы должны делать все, чтобы понравиться человеку своими действиями». Более оптимальному решению проблемы домашнего насилия будет способствовать и более тесное взаимодействие сотрудников органов внутренних дел и психологов.

УДК 347.78

***А.Я. Гучок***

## СУБ'ЕКТЫ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: КІРАЎНІКІ І САІСКАЛЬНІКІ

Традыцыйна да кампанентаў сістэмы навуковай дзейнасці адносяцца суб'ект навуковай дзейнасці (даследчык), аб'ект даследавання і сродкі даследавання. Суб'екты навуковай дзейнасці – гэта сістэмаўтваральныя складальнікі любога навукова-пазнавальнага працэсу. Пры гэтым асаблівую цікавасць уяўляе пытанне аб узаемадзеянні і ўзаемаадносінах навуковых кіраўнікоў (кансультантаў) і саіскальнікаў вучоных ступеняў як суб'ектаў навуковай дзейнасці, укладзе кожнага з іх у адпаведнае дысертацыйнае даследаванне і аўтарстве новых ведаў, якія з'яўляюцца асноўным паказчыкам грунтоўнасці навукова-пазнавальнага працэсу, а такім чынам, і адпаведнасці саіскальніка ўзроўню патрабаванняў вучонай ступені.

Відавочна, што пазначаная праблема складаная і шматаспектная. Фармальны падыход навуковых кіраўнікоў да працы з саіскальнікамі, відавочнае іх адставанне ад сваіх вучняў у веданні сучасных інфармацыйных тэхналогій, кансерватызм, а часам і архаічнасць прапанаваных маладым навукоўцам у якасці кірункаў даследавання творчых задум і многае іншае, а таксама несфармаваная матывацыя саіскальнікаў, недапушчальна негатыўнае стаўленне да работы над дысертацыяй з прычыны занятасці

на працы і па іншых прычынах, несамастойнае, праз выкарыстанне паслуг розных структур і асоб напісанне дысертацыі і г. д., могуць выступаць у якасці сур'ёзных перашкод у дзейнасці па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Асобная прагназуемая праблема – кіраўніцтва (кансультаванне) саіскальнікаў асобамі, чыя навуковая кваліфікацыя меркавана сумніўная. Верагоднасць з'яўлення такіх суб'ектаў з улікам павелічэння колькасці аб'яў аб платнай падрыхтоўцы дысертацый як юрыдычнымі асобамі, так і індывідуальнымі прадпрымальнікамі становіцца даволі высокай.

У гэтай сувязі цікавасць можа ўяўляць распрацоўка тыповага профілю ілжэнавукоўца, своеасаблівага партрэта, які дазволіць распазнаваць махляроў, што маюць намер рэалізаваць сябе ў якасці навуковых кіраўнікоў. Згаданы партрэт можна пабудаваць на аснове крыміналістычных і крыміналагічных методык. Гэта дазволіць распазнаваць пэўных суб'ектаў пры іх з'яўленні ў навуковым асяроддзі і весці далейшую актыўную работу ў кірунку пазбаўлення іх права работы з маладымі навукоўцамі, далейшага ўстанаўлення фактаў несамастойнай падрыхтоўкі дысертацый самімі гэтымі суб'ектамі, а адпаведна і вырашаць пытанне аб іх прыцягненні да адказнасці.

Названы профіль (партрэт) у самым агульным выглядзе можа аб'ядноўваць у якасці тыповых наступныя звесткі пра ілжэнавукоўца:

вельмі нязначная колькасць адзінаасобна падрыхтаваных публікацый «навукоўца», якія, як правіла, рэтранслююць асобныя часткі «уласнай» дысертацыі;

наяўнасць публікацый, у якіх беспадстаўна крытыкуюцца пункты гледжання іншых навукоўцаў, прычым без прадстаўлення якіх-небудзь высноў;

неразвітасць гаворкі, ненавуковасць мовы выкладання матэрыяла, неваладанне эмпірычнымі ведамі;

замест выступленняў на навуковых форумах засяданне ў прэзідыумах і ацэньванне дакладаў;

накіраванасць на вырашэнне лёсу маладых даследчыкаў, як правіла, з ухілам у бок неабгрунтаванай крытыкі іх прац, якія ім і не вывучаліся;

імкненне да набыцця так званага пашырэння колькасці навуковых спецыяльнасцяў, па якіх «навуковец» мае права выступаць ў якасці эксперта, апанента, спецыяліста па дысертацыях (пры дапушчальнасці выкарыстання інстытута пашырэння толькі ў выключных выпадках і абсалютнай сумніўнасці яго распаўсюджвання, якое прыводзіць да сітуацый, калі ацэнку дысертацыям на этапе абароны ці падчас яе далейшых экспертыз даюць неспецыялісты);

прымітывізм ва ўласных публічных выступах, на лекцыях, навуковых сімпозіумах, прадстаўленне аднаго і таго ж далёка не навуковага даклада (як правіла, гэта павучэнне таму, як трэба правільна ставіцца да «ўзнёслага» прафесарства) на розных форумах на працягу дзесяцігоддзяў;

вельмі слабыя дысертацыі вучняў, прычым не па прычыне няздольнасці саіскальнікаў, а менавіта па прычыне таго, што ілжэнавуковец як кіраўнік здольны толькі замінаць маладым даследчыкам;

залішняя канфліктнасць (канфлікты са студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі і інш. па прычыне іх (студэнтаў і г. д.) відавочнай інтэлектуальнай і культурнай перавагі, неадэкватная (заніжаная) ацэнка ведаў, галоўным чынам, выдатна паспяваючых навучэнцаў);

схільнасць да самаўсхвалення і патрабавання яго публічнай пахвалы іншымі, а таксама патрабавання ад саіскальнікаў спасылацца ў працах (артыкулах, манаграфіях, тэзісах, дысертацыях, аўтарэфератах) на яго «навуковыя працы», нават у выпадках, калі ён не мае ніякага дачынення да пэўнай праблематыкі;

прымус маладых навукоўцаў і іншых залежных ад ілжэнавукоўца асоб да сааўтарства ў публікацыях, што праяўляецца ў мінімальнай колькасці яго аўтарскіх публікацый.

Паўната характарыстыкі такіх суб'ектаў на этапе іх самастойнай «навуковай» дзейнасці павінна забяспечвацца і звесткамі пра іх магчымае стаўленне да навуковых прац (дысертацый, якія прадстаўляюцца да абароны), падрыхтаваных асобамі, якія не ўваходзяць у сферу іх карпаратыўных інтарэсаў (напрыклад, саіскальнікі і іх навуковыя кіраўнікі, якія раней не прыцягваліся да «перакрыжаванага апаніравання», і інш.). Да такіх фактаў і звестак могуць быць аднесены:

беспадстаўная крытыка назвы і структуры працы пры відавочным няведанні яе зместу;

заявы пра тое, што ў працы «недастаткова навукі», што «выкарыстоўваецца састарэлая метадалогія», без якіх-небудзь каментарыяў;

указанне на адсутнасць практычнай, эканамічнай, сацыяльнай значнасці (нават пры іх відавочнасці), у тым ліку і па прычыне таго, што праца не вывучана;

катэгарычнасць пры адмаўленні прадставіць пісьмовыя дакументы з выкладам сваіх заўваг, асабліва заключэнняў, якія патрабуюць аператыўнага выканання і выключаюць працяглы часавы прамежак на аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы такіх матэрыялаў іншымі асобамі;

нявызначанасць і некарэктнасць задаваных пытанняў, няведанне сучаснай навуковай тэрміналогіі;

абскурантызм;

спробы загадзя ўцягнуць саіскальніка, яго кіраўніка, кансультанта, іх аднадумцаў у сістэму карпаратыўных дэвіянтных адносін, напрыклад таго ж «перакрыжаванага апаніравання» і інш.;

кампенсаванне ўласнай недасканаласці спробамі выставіць сябе патрыярхам навуковай школы, выбітным мысляром, філосафам, літаратарам, паэтам-містыкам, атлетам;

баязлівасць адкрыта выступаць у якасці рэальнага апанента па дысертацыях, двухаблічнасць і хлуслівасць.

Неабходнасць пабудовы разгледжанай мадэлі абгрунтоўваецца тым, што з яе дапамогай могуць быць вызначаны канкрэтныя аб'екты, якія могуць выклікаць цікавасць у аспекце ўстанаўлення фактаў несамастойнай падрыхтоўкі дысертацый.

Канкрэтызацыя забяспечвае распрацоўку адрасных мерапрыемстваў прафілактычнага, прававога, арганізацыйнага, а ў некаторых выпадках крыміналістычнага і аператыўна-вышуковага характару, накіраваных на забеспячэнне законнага і эфектыўнага функцыянавання сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.